# ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА
# РЭКТАРА ЎНІВЕРСІТЭТА Н. П. БАРАНАВАЙ

Шаноўныя госці і ўдзельнікі канферэнцыі, дарагія калегі і сябры!

Дазвольце сардэчна вітаць вас на XIX Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», якая ў гэтым годзе мае некалькі адметнасцей.

1) канферэнцыя прысвечана 75-й гадавіне Вялікай Перамогі. Да гэтай надзвычай важнай падзеі супрацоўнікамі Цэнтра беларускай мовы і культуры падрыхтаваны дзве новых выставы: гістарычныя выданні па тэме «Жыві і помні» і асабістыя біяграфіі «Беларускія пісьменнікі на вайне».

2) канферэнцыя праходзіць у перыяд пачатку працы беларуска-германская камісіі гісторыкаў, створанай 2 месяцы назад у Берліне ў адпаведнасці з даручэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка і Федэральнага прэзідэнта Германіі Ф.-В. Штайнмайера.

Паводле пункта 1 сумеснага камюніке, прынятага 1 лютага б. г., камісія будзе прыкладаць намаганні для сумеснага даследавання беларускай і нямецкай гісторыі, раскрыцця транснацыянальных і адметных беларуска-германскіх гістарычных сувязяў. У гэтым плане пошук новых дакументальных крыніц, напісанне калектыўных манаграфій з удзелам прадстаўнікоў дзвюх краін адкрывае новыя як блізкія, так і далёкія перспектывы ў даследаванні малавядомых праблем гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Такія вынікі будуць запатрабаваны не толькі прафесійнымі навукоўцамі, але перш за ўсё студэнцкай моладдзю. Таму значэнне канферэнцыі асабліва актуальна ў справе далейшага развіцця беларускай гістарычнай навукі, а таксама адукацыі і выхавання нашага студэнцтва.

3) канферэнцыя выступае ў якасці адкрытай пляцоўкі для абмеркавання серыі кніг, выстаўленых у гэтай зале і вылучаных на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусі 2020 года. Пераканана, што яны будуць не толькі ўсебакова абмеркаваны, але і знойдуць падтрымку сярод удзельнікаў. На вялікі жаль абмеркаванне будзе праходзіць без аднаго з аўтараў, сябра рэдакцыйнай калегіі з 2004 г., які заўчасна пайшоў з нашага жыцця – прафесара, доктара гістарычных навук Анатоля Васільевіча Шаркова. Яго працы былі ў свой час уласнаручна падораны аўтарам Цэнтру беларускай мовы і культуры і бібліятэцы ўніверсітэта.

Нагадаю, што XIX Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» праводзіцца ў адпаведнасці з планам выканання кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і міжнароднага турызму заключнага задання тэмы НДР у рамках падпраграмы «Гісторыя і культура» Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Гісторыя, культура, грамадства і дзяржава» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя).

Упэўнена, што правядзенне падобных сустрэч у МДЛУ на працягу апошніх амаль двух дзясяткаў гадоў стварала спрыяльныя ўмовы для першаснай апрабацыі новых матэрыялаў на існуючай навуковай пляцоўцы з удзелам беларускіх, латвійскіх, літоўскіх, нямецкіх, польскіх, расійскіх і ўкраінскіх даследчыкаў. Новыя думкі і высновы, якія з'явяцца ў выніку абмеркавання пастаўленых праблемных пытанняў, не застануцца толькі ў сферы акадэмічнай навукі, але паўплываюць на вырашэнне актуальных задач у нашым грамадстве, асабліва ў справе выхавання і прафесійнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі. Студэнты нашага ўніверсітэта актыўна ўдзельнічаюць ў навуковай працы, творча даследуючы гістарычную праблематыку і выкарыстоўваючы свае гісторыка-дакументальныя напрацоўкі пры выкананні курсавых і дыпломных праектаў па напрамку спецыяльнасці «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (міжнародны турызм)».

Дарагія сябры! Дазвольце аб'явіць адкрытай XIX Міжнародную навуковую канферэнцыю «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» і пажадаць вам поспехаў у яе правядзенні і дасягненні новых вяршынь на ніве гістарычнай навукі.